Пралетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 62 (131)
СУБОТА
16
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРШАЯ НАРАДА СЯЛЯН БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

НА АБЛАСНОЙ НАРАДЗЕ СЯЛЯН

Учора ў гарадскім тэатры адбылася абласная нарада сялян, скліканая абкомам партыі. На нарадзе прысутнічала больш 600 чалавек. Яны ўпершыню за ўсё сваё жыццё сабраліся, каб абмеркаваць пытанне, як найлепш падрыхтавацца да першай совецкай вясны і правесці сяўбу на вызваленай зямлі.

Выбіраецца дзелавы прэзідыум у складзе 30 чалавек. Цёпла сустракаюць прысутныя прапанову запрасіць у прэзідыум прадстаўнікоў калгасаў усходніх абласцей БССР.

Бурнай авацыяй нарада сустракае прапанову выбраць у пачотны прэзідыум.

Пад громкія апладысменты ў пачотны прэзідыум выбіраюцца таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Андрэеў, Жданаў, Мікаян, Хрушчоў, Берыя, Швернік, Дзімітраў, Тэльман, Хозе Дыас.

З дакладам аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы і правядзенню веснавой сяўбы выступіў сакратар абкома КП(б)Б тав. **Ігаеў**. Ён гаворыць аб тых велізарных зменах у жыцці вызваленага народа, якія адбыліся за час совецкай улады. Сяляне атрымалі зямлю, аб якой яны доўгія гады марылі. Паміж батракамі, беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі Беластоцкай вобласці раздзелена 85.927 гектараў зямлі, у тым ліку ворнай 70.941 гектар, сенажацей—12.522 гектары. Усяго атрымалі зямлю 28.733 гаспадаркі.

Працоўныя атрымалі не толькі зямлю. Яны маюць права на бясплатнае лячэнне і абучэнне дзяцей у школах. Яны сталі роўнапраўнымі грамадзянамі вялікай краіны соцыялізма. За ўсё гэта працоўныя горача, ад усяго сэрца дзякуюць большэвіцкай партыі, Чырвонай Арміі і вялікаму Сталіну.

Далей тав. Ігаеў спыняецца на задачах падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

— Калгасы ўсходніх абласцей Беларускай ССР, — гаворыць дакладчык,—уключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва за атрыманне 100 пудоў зернавых з гектара. Я думаю, што працоўныя сяляне нашай вобласці павінны паследваць прыкладу калгаснікаў усходніх абласцей.

Далей у сваім дакладзе тав. Ігаеў гаворыць аб тым, што неабходна зараз зрабіць, каб узорна падрыхтавацца і па-большэвіцку правесці веснавую сяўбу. Перш за ўсё неабходна добраякасна ачысціць насенне яравых культур, своечасова адрамантаваць сельскагаспадарчы інвентар, сабраць і вывезці на поле ўгнаенне. Ён заклікае сялян быць пільнымі да класавага ворага.

Пасля даклада пачаліся выступленні сялян. Першым выступае селянін Парэцкага раёна тав. **Токаць Іван**.

— Нас сагрэлі праменні Сталінскай Канстытуцыі. Мы зажылі радасным, шчаслівым жыццём. Мы зробім усё для таго, каб па-большэвіцку правесці першую совецкую вясну.

У сувязі з падрыхтоўкай да вясны і выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, дзень выбараў—24 сакавіка—мы сустрэнем узорнай падрыхтоўкай да веснавой пасяўной кампаніі.

Выступае тав. **Салей** з вёскі Лаша Гродненскага раёна. Ён гаворыць:

— Мы ў сваёй вёсцы арганізавалі калгас. Калгаснікі дружна ўзяліся за работу. Яны далі слова, што будуць чэсна працаваць і даб'юцца высокага ўраджаю. Мы ўжо абагулілі коней, кармы. Распачалі рамонт сельскагаспадарчага інвентару, падрыхтоўваем высокаякаснае насенне.

Затым выступіў старшыня калгаса «Чырвоны агароднік», Мінскага раёна, ордэнаносец тав. **Трушкевіч**. Ён расказаў сялянам, як калгас дабіўся высокіх ураджаяў.

— Калгаснікі нашага калгаса,—гаворыць т. Трушкевіч, — у гэтым годзе атрымалі на працадзень зернавых 1 кілограм 200 грам., бульбы 17,6 кілограм і 7 руб. 70 кап. грашыма. У хатах калгаснікаў ярка свеціцца лямпачка Ільіча. У кожнай калгаснай хаце ёсць радыё. Многія калгаснікі маюць патэфоны.

На трыбуне **Дземех** Люба, калгасніца Дамброўскага раёна:

— Мы прыкладзем усе сілы для таго, каб дабіцца высокага ўраджаю. Мы добра разумеем, што чым больш будзе ў нас ураджай, тым магутнейшай будзе наша дзяржава. Веснавую сяўбу мы правядзём па-большэвіцку.

Выступае **Ражко Анастасія** з вёскі Жарно, Валкавыскага раёна:

— У нашай вёсцы арганізаваўся калгас. Мы будзем працаваць добрасумленна, чэсна, каб зрабіць сваё жыццё заможным, такім, якім жывуць нашы браты—калгаснікі ва ўсходніх абласцях Беларускай ССР.

Цёпла сустрэлі прысутныя выступленне тав. **Ероменка**, які расказаў аб магутнай сіле нашай Чырвонай Арміі.

Стоячы, пад незмаўкаючыя апладысменты прымаецца прывітальнае пісьмо праваднру нарады таварышу Сталіну.

* *
*

На вячэрнім пасяджэнні працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Ігаева. У спрэчках выступалі селянін Гродненскага раёна тав. **Буднік**, сялянка Заблудаўскага раёна тав. **Міронччык**, аграном Мінскага раёна тав. **Цубарава** і іншыя дэлегаты нарады.

З вялікай прамовай аб задачах пасяўной кампаніі выступіў на нарадзе сакратар абкома КП(б)Б тав. **Касцюк**.

Пасля прамовы тав. Касцюка нарада прыняла рашэнне аб спыненні спрэчак. З заключнай прамовай выступіў тав. Ігаеў.

Пад бурныя апладысменты і прывітальныя воклічы былі прыняты прывітальныя тэлеграмы таварышам Молатаву і Варашылаву.

Затым нарада прыняла зварот да ўсіх сялян Беластоцкай вобласці аб правядзенні першай большэвіцкай вясны і рашэнне аб выкліку Баранавіцкай вобласці на соцспаборніцтва па правядзенню пасеўнай кампаніі. Нарада выбрала 11 прадстаўнікоў для заключэння соцыялістычнага дагавора на соцспаборніцтва і рашыла правесці ў час пасеўнай кампаніі раённыя нарады і сходы па сельсоветах для абмеркавання ходу соцспаборніцтва.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.

ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

У знамянальныя дні падрыхтоўкі да выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ад заходніх абласцей Беларусі і Украіны мы, удзельнікі абласной нарады сялян Беластоцкай вобласці, сабраўшыся для абгаварэння пытанняў падрыхтоўкі і правядзення вясенняй сяўбы, шлём Вам, дарагі наш бацька і настаўнік, Іосіф Вісарыёнавіч, сваё гарачае сардэчнае прывітанне.

Мы сабраліся, каб абгаварыць пытанне сустрэчы і правядзення першай совецкай вясны на палях заходніх абласцей Беларусі. Гэтыя палі, багата палітыя потам і крывёю народнай, толькі нядаўна перайшлі ў рукі працоўных сялян. Шэсць месяцаў таму назад тут гаспадарылі польскія паны. Самая лепшая зямля ў Беластоцкай вобласці належала памешчыкам. Памешчыкі, асаднікі і кулакі мелі ў сваім карыстанні 50 процантаў усёй зямлі, у той час як больш 46 процантаў сялянскіх гаспадарак Беластоцкай вобласці амаль не мелі зямлі. За кошт лютай эксплаатацыі сялянства жылі ў раскошы ўсякія любамірскія, патоцкія, чапскія і іншыя паны і графы. У ярме эксплаатацыі трымалі яны працоўнае сялянства.

Уладарніцтву памешчыкаў настаў канец. Па Вашаму ўказанню доблесная Чырвоная Армія назаўсёды вызваліла нас ад памешчыцкага ярма і ўзяла пад сваю абарону. Сонца Сталінскай Канстытуцыі паднялося над краем. Пад яго сагравающымі праменнямі ажыў прыгнечаны раней народ і пачаў па-новаму перабудоўваць сваё жыццё. Няма і не будзе больш у нашым краі памешчыкаў, банкіраў і фабрыкантаў. У рукі народа перайшлі створаныя яго працай багацці. І ніхто не пасмее пасягнуць на наша шчаслівае жыццё.

Новая перамога мірнай палітыкі Совецкага Саюза бясконца радуе сэрцы працоўных заходніх абласцей Беларусі, як і ўсяго Совецкага Саюза. Заключэнне мірнага дагавора з Фінляндыяй зрабіла граніцы нашай любімай радзімы яшчэ больш непрыступнымі. Над слаўным горадам Леніна не будзе больш вісець пагроза.

Праваліліся яшчэ адна авантура імперыялістаў. Але мы ведаем Вашы ўказанні аб небяспецы капіталістычнага акружэння і будзем нястомна мацаваць нашу дарагую радзіму. Будзем множыць багацці нашай зямлі. Дадзім больш зярна, лёну, бульбы, гародніны для краіны соцыялізма.

Рыхтуючыся да першай совецкай вясны, мы абяцаем Вам, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, правесці яе па-большэвіцку. Па прыкладу сялян-калгаснікаў усходніх абласцей Беларусі і ўсяго Совецкага Саюза будзем змагацца за высокія сталінскія ўраджаі.

Мы завяраем Вас, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, што вясеннюю пасяўную кампанію першай большэвіцкай вясны правядзём на аснове соцыялістычнага спаборніцтва усіх раёнаў, сельсоветаў, калгасаў і вёсак, высокаякасна і ў самы кароткі тэрмін.

Няхай жыве наша першая большэвіцкая вясна!

Няхай жыве слаўная комуністычная партыя Леніна — Сталіна!

Няхай жыве наш родны вялікі Сталін!



ІГНАЦІЙ АКІМАВІЧ БАНЦЫРАЎ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 379.

Выступленне тав. Токаць Івана

(Парэцкі раён)

— Калісьці ў такім тэатры толькі польскія чыноўнікі і магнаты праводзілі свае вечары. Нам, сялянам — батракам і беднякам—не прыходзілася і думаць аб тым, каб трапіць у такое месца. Але вось зараз, без капіталістаў і памешчыкаў, мы свабодна вырашаем тут важнейшыя пытанні свайго жыцця. Гэту магчымасць мы атрымалі дзякуючы Чырвонай Арміі, якая раз і назаўсёды знішчыла капіталістычнае прыгнечанне.

Прайшло шэсць месяцаў жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, а якія велізарныя адбыліся змены. Той, хто раней не лічыўся за чалавека, зараз нароўні з усімі рыхтуецца выбіраць і выбірацца ў вярхоўныя органы ўлады. Вось чаму мы, працоўныя, актыўна ўдзельнічаем ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях, якія праводзіць партыя і Совецкі ўрад. Сяляне нашай вёскі даўно выканалі план лесазагатовак, і правалі лішкі сельгаспрадуктаў дзяржаве.

У нашай вёсцы налічваецца 80 гаспадарак, з якіх 76 уступілі ў калгас і актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Праз пару дзён у калгасе будзе поўнасцю адрамантаван сельскагаспадарчы інвентар і ачышчана насенне яравых.

Уся работа па падрыхтоўцы да сяўбы ў нас спалучаецца з падрыхтоўкай да выбараў. Ва ўсенароднае свята працоўных дзень 24 сакавіка аднадушным галасаваннем за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных мы прадэманструем сваю любоў да соцыялістычнай радзімы і вялікай партыі Леніна — Сталіна.

Выступленне тав. Кухта Александра

(Валкавыскі раён)

— Цяжка становіцца на сэрцы, калі ўспамінаеш аб праклятым мінулым жыцці сялян у былой панскай Польшчы. Магнаты-памешчыкі пілі нашу кроў; душылі вольную думку селяніна, рабавалі бедняхоў і серадняхоў і за кошт сялянства набівалі сабе кішэні. Доблесныя байцы Чырвонай Арміі вызвалілі нас назаўсёды з-пад ярма эксплаатацыі і прыгнечання. І вось зараз мы ў дружнай сям'і з вялікім совецкім народам зажылі новым, свабодным і радасным жыццём пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Па прыкладу сялян усходніх абласцей нашай Беларускай Соцыялістычнай Рэспублікі многія бедняхі і серадняхі Парэцкага раёна рашылі ў першую совецкую вясну праводзіць сяўбу не на асобных палосках, а на прасторным калгасным масіве. Ужо зараз у раёне больш 200 сялянскіх гаспадарак падалі заявы аб уступленні ў калгас. У раёне ідзе дзейная падрыхтоўка да сяўбы. Праводзіцца рамонт сельгасінвентару і ачыстка насення.

8 дзён засталося да знамянальнага дня ў нашым жыцці. 24 сакавіка мы ўпершыню будзем выбіраць сваіх прадстаўнікоў у соцыялістычны парламент на аснове самай дэмакратычнай Канстытуцыі. У гэты дзень мы ўсе, як адзін, пойдзем на выбарчыя ўчасткі і аддадзім свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Аднадушным галасаваннем прадэманструем сваю бязмежную любоў і адданасць нашай партыі і вялікаму Сталіну.

Выступленне тав. Ражко Анастасіі

(Валкавыскі раён)

— Не магла нават і марыць я, бедная сялянская ўдава, аб палепшэнні свайго жыцця пры панскім ладзе. Беспрасветная праца на мірзеда-памешчыка — вось што было маім лёсам. Працавала не пакладаючы рук, а карміцца двайм дзецям і самой не было чым. Жудаснае жыццё канула ў вечнасць. Зараз я зажыла новым жыццём. Совецкая ўлада забяспечыла мне і маім дзецям магчымасць жыць, вучыцца і працаваць.

З прыходам Чырвонай Арміі я актыўна ўключылася ў грамадскую работу. У нашай вёсцы 80 гаспадарак уступіла ў калгас. Зараз абагулілі коней і сельскагаспадарчы інвентар і разгарнулі работу па ачыстцы насення. Вялікая работа ў калгасе праводзіцца і па рамонту сельгасінвентару. Разам з падрыхтоўкай да сяўбы мы рыхтуемся да прадстаячых выбараў сваіх прадстаўнікоў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Аб прысваенні імені Молатава В. М. Валагодскаму Дзяржаўнаму педагагічнаму інстытуту і 23 школе Валагды.

Задаволіць просьбу валагодскіх грамадскіх арганізацый і прысвоіць імя тав. Молатава В. М. Валагодскаму Дзяржаўнаму педагагічнаму інстытуту і 23-й школе Валагды.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль
15 сакавіка 1940 г.

24 САКАВІКА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 353 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Лаўрэнцій Фаміч Цанава

КАРОТКАЯ БІЯГРАФІЯ)

Лаўрэнцій Фаміч Цанава нарадзіўся ў 1900 годзе ў сям'і селяніна ў сонечнай Грузіі. Сям'я жыла бедна. З юнацкіх год тав. Цанава працай здабываў сабе сродкі на існаванне і вучобу. Такім чынам ён атрымаў сярэднюю асвету.

У 1920 годзе, у перыяд панавання ў Грузіі меншавікоў, т. Цанава ўступіў у рады большэвіцкай партыі. Да лютага месяца 1921 года ён праводзіў партыйную работу ў падполлі, арганізуючы барацьбу супроць меншавікоў.

З першых дзён совецкай улады ў Грузіі партыйная арганізацыя паслала тав. Цанава на кіруючую работу ў органы ВЧК-АДПУ. Там ён працаваў з 1921 па 1933 год з некаторымі перарывамі. Ён вёў актыўную і бязлітасную барацьбу з контррэволюцыйнымі, антысовецкімі элементамі. За гэты час ворагі не раз прабавалі забіць тав. Цанава. Ён атрымаў дзевяць ран ад варожых куль.



З 1921 года тав. Цанава бесперапынна выбіраўся ў склад членаў раённых, павятовых і гарадскіх партыйных камітэтаў і іх бюро па месцу сваёй работы.

У канцы 1934 года тав. Цанава перавялі на партыйную работу. Ён працаваў сакратаром раённага, потым гарадскога камітэта партыі. У гэты час ён быў членам ЦК КП(б) Грузіі.

За часы работы ў органах ВЧК-АДПУ тав. Цанава ўзнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга Грузінскай ССР, баявой зброяй і іншымі ўзнагародамі.

Лаўрэнцій Фаміч Цанава ў сучасны момант з'яўляецца членам Рэвізійнай Камісіі ЦК ВКП(б), дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР. У канцы 1938 года тав. Цанава быў назначан Народным Камісарам Унутраных Спраў Беларускай ССР, дзе працуе і зараз. Тав. Цанава з'яўляецца членам Бюро ЦК КП(б)Б.

Працоўныя гор. Беластока вылучылі тав. Цанава кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па 353 выбарчай акрузе.

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 347 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Дзмітрый Георгіевіч Дуброўскі

[(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Па далінах і па ўзгор'ях ішла да возера Хасан стралковая дывізія. Вузенькае шасе змяілася па тайзе, стралой узлятала на сопкі, гублялася паміж скаламі. Затым пачалося бездарожжа. Абшырныя балоты, быстрыя горныя рачулкі перагароджвалі шлях байцам. Але дывізія рухалася імклівым маршам, выконваючы баявы загад.

На чацвёртыя суткі наперадзе бліснула водная гладзь.

— Хасан! — прашумела ў калонах.

Дывізія заняла свой участак. На вышыні 68,8 (кілометр ад праціўніка), быў яе камандны пункт. Камандзір дывізіі палкоўнік Берзарын і камісар Дзмітрый Дуброўскі ў біноклі глядзелі на варожыя пазіцыі.

— Акапаліся, чэрці, — адрывіста прамовіў палкоўнік.

— Вышыбем, — адгукнуўся камісар.

Японцы стралялі па каманднаму пункту. Ад уздрыгаў паветра развальваліся пясчаныя акопчыкі. Уночы самураі падпаўзлі да вышыні 68,8 і адкрылі ружэйна-кулямётны агонь. Ворагі адкінуты з вялікімі для іх стратамі.

Па начах камісар дывізіі ішоў у палкі, гутарыў з байцамі і камандзірамі, комуністамі і комсамольцамі, узнімаў настрой, натхняў. Удзень паўзком прабіраўся ад падраздзялення да падраздзялення, правяраў веданне баявой задачы, паказваў прыклад бясстрашнага выканання воінскага доўгу. Асабіста і праз камандзіраў і палітработнікаў перадаваў у часці вопыт 40 дывізіі і пагранічнікаў, якія пабывалі ўжо ў баях; вучыў стральбе на хаду, гранатамятанню, штыкавому бою.

Варочаўся на вышыню і зноў аглядаў у бінокль варожыя ўмацаванні. З камандзірам дывізіі, сувязістамі і кулямётчыкамі перабраўся на адгор'е. Адсюль наглядаць было лепш.

— Падмацаванні перакідваюць, — заўважыў камісар. Сапраўды, праз раку Тюмень-Ула перапраўлялася мноства шаланд з японцамі. Неадкладна аб гэтым паведамілі па тэлефону артылерыстам. Фантаны вады ўскінуліся над ракой. У трэскі сталі разлятацца шаланды. Камандзір і камісар дывізіі перамігнуліся, узбуджана высунуліся з акопа. Японцы заўважылі рух на адгор'і вышыні, пачалі артылерыйскі абстрэл. З свістам і выццём праносіліся снарады. Пералёт, недалёт, яшчэ пералёт.

— У вілку ўзялі, — падумаў камісар, лежачы на дне акопа. Яго ўдарыла асколкам. Снарады рваліся ўсё бліжэй. Разгараваныя, вострыя, як ручная піла, асколак упіўся ў пясок ля нагі камандзіра дывізіі. Мінут 30—40 стралялі японцы. Прыпынілі — відавочна, думаючы, што на адгор'і няма нікога ў жывых.

Камісар заўважыў: уздоўж бруствера японцы перацягваюць процітанкавую гармату. Стаў ар'ентыраваць кулямётчыка.

— Не відаць, таварыш камісар, — адказаў той.

Тады Дзмітрый Дуброўскі па-пластунску падпоўз да кулямёта, выпусціў палову стужкі. Відаць было, як падалі японцы ля гарматы. Група японцаў паказалася наперадзе. Зноў затарахцеў кулямёт і сталі валіцца, узмахваючы рукамі, японскія салдаты.

— Беражыце сябе, таварыш палкавы камісар,— сказаў кулямётчык, перахватваючы ручкі.

Стралковая дывізія, кіруемая Берзаніным і Дуброўскім, у баях ля Хасана паказала ўзоры бяспрыкладнай мужнасці і гераізма, бязмежнай адданасці справе Леніна — Сталіна. У час баёў сотні чырвонаармейцаў і камандзіраў сталі комуністамі і комсамольцамі. Каля двух тысяч байцоў і камандзіраў стралковай узнагароджаны ордэнамі і медалямі Саюза ССР. Дывізія ў цэлым узнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга. Ордэн Чырвонага Сцяга — сімвал мужнасці і геройства — упрыгожвае грудзі баявога камісара.

* * *

Слаўны жыццёвы шлях ляжыць за плячыма Дзмітрыя Георгіевіча Дуброўскага. Тав. Дуброўскі нарадзіўся у 1904 годзе, у сям'і селяніна-бедняка, у вёсцы Градор, Валагодскай губерні. Там скончыў 4-класную школу. Хацелася вучыцца далей, але беднасць перашкаджала.

У 1920 годзе ён уступае ў комсамол. Совецкая ўлада шырока раскрывае яму, як і мільёнам працоўных, дарогу ў новае жыццё. Скончыўшы Ленінградскую пяхотную школу, тав. Дуброўскі працуе два годы камандзірам стралковага ўзвода ў адной з часцей Сібірскай ваеннай акругі. З сакавіка 1926 года — членам ВКП(б). Па сканчэнні Ваенна - палітычных курсаў працуе палітруком роты, ваенкомам асобнай роты сувязі, сакратаром партыйнага бюро, ваенкомам часці. Удзельнічаў у баях з белакітайцамі на Кітайска-Усходняй чыгунцы ў 1929 годзе.

Зноў — Ленінград, вучоба ў Ваенна-палітычнай акадэміі ім. Леніна.

Партыя пасылае яго ў 1-ю Асобную Чырвонасцяжную Армію ваенкомам злучэння.

У верасні мінулага года Д. Г. Дуброўскі быў назначан членам Ваеннага Совета арміі. Ён энергічна ўзяўся за работу. У вагоне, на дарозе к фронту, ён сабраў работнікаў Пуарма і азнаёміў іх з вопытам палітработы ў баявых умовах. Бесперапынна знаходзіўся ў часцях, дапамагаў камандзірам і палітработнікам клапаціцца аб своечасовым падвозе боепрыпасаў і харчаванняў. Удзень і ўночы бачылі яго байцы на перадавых пазіцыях. Адчувалі яго клопаты аб сабе, стараліся ўзорна выканаць баявую задачу.

Закончыўся вызваленчы паход. Па-ранейшаму часта бывае ў гарнізонах член Ваеннага Совета. Ён першай справай ідзе да байцоў у падраздзяленне, бо тут куецца перамога. Гутарыць з чырвонаармейцамі і камандзірамі, даведваецца, як арганізована вучоба, быт, адпачынак. Прысутнічае на занятках. Карыстаючыся сваім багатым баявым вопытам, дае каштоўныя ўказанні па методыцы і арганізацыі вучобы.

Моцна дапамагае тав. Дуброўскі, бываючы ў часцях, палітработнікам, партыйным і комсамольскім арганізацыям. Дабіваецца перабудовы партыйна-палітычнай работы, сканцэнтравання яе на пытаннях баявой вучобы, вядучай ролі комуністаў і комсамольцаў. На месцы ўстараняе недахопы. Усе свае сілы аддае слаўнай справе ўмацавання баявой гатоўнасці часцей.

* * *

Акруговая выбарчая камісія Саколкаўскай выбарчай акругі № 347 зарэгістравала ордэнаносца Дзмітрыя Георгіевіча Дуброўскага кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Хадыка.

НА ВЫБАРЧЫМ УЧАСТКУ

Досыць было настаўніцы 2-й яўрэйскай школы Розель Абрамаўне Фрыдман, актывістцы і агітатару выбарчага ўчастка № 2, зайсці ў адну кватэру і сказаць, што зараз адбудуцца чарговыя заняткі гуртка па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона, як гэта вестка адразу-ж даляцела да ўсіх слухачоў гуртка Далейшае апавяшчэнне ў момант зрабілі самі выбаршчыкі.

Невялікі клас школы запоўнілі лысыя і сівыя старыкі, пажылыя жанчыны і рэзвая моладзь. Сюды прышлі і яўрэі, і палякі, і беларусы.

За сталом агітатар Гарэлаў. Сёння ён расказваеаб дзяржаўнай уладзе і выбарчай сістэме краіны соцыялізма. Мелам на дошцы ён паказвае дзве палаты вышэйшага органа ўлады і тлумачыць іх назначэнне, задачы і парадак выбараў у іх.

— Кандыдатам у Совет Нацыянальнасцей, — гаворыць тав. Гарэлаў, — у нас вылучан тэхнарук Ломжынскага завода сельскагаспадарчых машын Іван Антонавіч Турлейскі, у Совет Саюза беластоцкая тэкстыльшчыца Марыя Іванаўна Дзьячук, а ў Вярхоўны Совет БССР сялянка-беднячка з вёскі Удзеньконь—І Ольга Кірылаўна Мазалеўская.

Агітатар падкрэслівае, што жанчыны капіталістычных краін, у тым ліку і былой панскай Польшчы, наогул не карысталіся выбарчым правам. А тут адразу дзве жанчыны вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты.

— Людзі яны нашы, за іх патрэбна галасаваць, не падвядуць.

Адна з жанчын сумняваецца і задае пытанне:

— Наш кандыдат Мазалеўская не мае вышэйшай асветы; як-жа яна будзе рашаць важныя дзяржаўныя справы?

Адказвае ёй сівы стары, які сядзіць побач.

— Ольга Кірылаўна бачыла нямала гора, ведае патрэбы народа. Там, дзе не будзе хапаць асветы, яна возьме класавым чуццём.

— Адукацыя, — умешваецца агітатар Гарэлаў, — справа нажыўная. Сёння яе няма, заўтра будзе. К гэтаму ў нас ёсць усе магчымасці. Мая маці, напрыклад, навучылася грамаце, калі ёй было 55 год.

Затым усе 32 прысутныя на занятках спушчаюцца ўніз, у школьны клуб, дзе змяшчаецца ўчастковая выбарчая камісія. Там таксама поўна народу.

— Вось у гэтым класе, — гаворыць намеснік старшыні ўчастковай выбарчай камісіі тав. Батвіннік, — будуць выдавацца выбарчыя бюлетэні, а там — кабіна для галасавання.

Выбаршчыкі праходзяць у самы большы ўпрыгожаны пакой. За сталом сядзіць старшыня камісіі 60-гадовы токар Вольф Лерман. Ён сусед выбаршчыкаў, жыве з імі на адной вуліцы.

— Тут, дарагія таварышы суседзі, — гаворыць ужо Лерман, — вы будзеце апускаць бюлетэні ў гэтую выбарчую урну. А зараз давайце праверым, ці правільна кожны з вас унесен у спіс выбаршчыкаў. Людзі абступілі спіс. Раптам нехта крыкнуў:

— Расступіцеся, дайце дарогу дзядулю, адыйдзіце ад святла!

Да спіска на кастылях пр...соўваецца бязногі сівы стар... Праз некалькі мінут пільнага ўглядання ён чытае, водзячы пальцам па спіску:

— Вамачынскі Осіп Антонавіч, год нараджэння 1864, адрас—вуліца Касцюшкі, дом № 18. Запісана дакладна!

Гэты дзед таксама прысутнічаў на занятках, а зараз ён расказвае групе моладзі:

— Нагу я страціў яшчэ пры цару Нікалаю ў сусветную вайну. Цяжка мне жылося пры польскіх кіраўніках. Сыны былі беспрацоўныя, жылі мы галодныя. Я жабрачыў. А зараз, калі да нас прышла Чырвоная Армія, сыны атрымалі работу, жыць стала лепш. На выбарах я буду галасаваць за совецкую ўладу. Свой голас я аддам за нашых кандыдатаў, на якіх я добра спадзяюся.

Выбарчы ўчастак зараз стаў сапраўдным цэнтрам палітычна-масавай работы з насельніцтвам. Акрамя кіраўніцтва 10-ю гурткамі, 26 агітатараў займаюцца з выбаршчыкамі па дамах. Агітатары правялі два агульныя сходы выбаршчыкаў. Асобна збіралі жанчын, моладзь. Некалькі разоў наладжваліся канцэрты мастацкай самадзейнасці. Дэманстрыраваліся новыя совецкія кінофільмы.

К. Васільеў.

М. Замбрава.

Нарада выбарчага актыва

Гродна. (Наш кар.). Адбылася нарада выбарчага актыва горада, на якой прысутнічала звыш 350 старшынь і членаў участковых камісій, кіраўнікоў агіткалектываў і агітатараў. Нарада падвяла вынікі работы па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Выступіўшыя на нарадзе таварышы падзяліліся вопытам сваёй работы.

Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі № 6 тав. Жураўлёва паведаміла, што на іх участку зараз працуе 44 гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Заняткі гурткоў рэгулярна наведваюць звыш 1.000 выбаршчыкаў.

Цікавыя даныя прывела тав. Шпільман — старшыня ўчастковай выбарчай камісіі № 8. На гэтым участку працуе звыш 50 агітатараў, чытачоў і бясядчыкаў. Кіраўнік агіткалектыва тав. Чэркоў арганізуе для іх семінары, даклады і гутаркі. Часта праводзяцца сходы выбаршчыкаў.

Вялікую ролю ў рабоце ўчастка іграе насценная газета. Яна асвятляе ход работы на ўчастку, паказвае вопыт работы лепшых агітатараў і ўскрывае недахопы адстаючых участкаў.

У сваім рашэнні выбарчы актыў вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па замацаванню маючыхся поспехаў у агітацыйна-масавай рабоце і па разгортванню большэвіцкай агітацыі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

В. Гарбакоў.

Актыўная прадвыбарчая работа

Ва ўпрыгожаных пакоях 80 выбарчага ўчастка Совецкай выбарчай акругі № 354 многалюдна. Больш 40 выбаршчыкаў прышлі пачытаць газеты, пагутарыць, паслухаць музыку.

На ўчастку ёсць насценгазета. Каля яе сабралася група моладзі. Адзін з іх у голас чытае артыкул.

Штодзённа ў 7—8 гадзін вечара на ўчастак прыходзяць выбаршчыкі.

На ўчастку былі арганізаваны 3 вечары для старых выбаршчыкаў і адзін—для моладзі. На гэтых вечарах былі зроблены даклады аб выбарах і аб міжнародным становішчы, паказана мастацкая самадзейнасць.

На ўчастку працуе каля 35 агітатараў. Усе яны працуюць чэсна і добрасумленна. Сістэматычна, 2 разы ў 6-дзёнку працуюць 11 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі. У кожным гуртку займаецца 25—30 чалавек.

Агітатары замацаваны за пэўнымі кварталамі і дамамі. Там яны праводзяць гутаркі ў кватэрах выбаршчыкаў. Кожны дзень пасля работы яны прыходзяць на ўчастак і даюць справаздачу аб сваёй рабоце.

Л. Лірская.

ПІСЬМЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ

АГІТУЮ ЗА НАШЫХ КАНДЫДАТАЎ

Калі яшчэ я была малой дзяўчынкай, я хацела вучыцца, але ў бацькоў не хапала сродкаў, і я не магла атрымаць веды. З малых год мне прыходзілася працаваць на фабрыкантаў.

Толькі з прыходам Чырвонай Арміі маё жыццё перамянілася. Зараз я ўжо не баюся беспрацоўя. Працую сельфактаршчыцай, удзельнічаю ў соцспаборніцтве, як і многія іншыя работніцы нашай фабрыкі. Акрамя таго, я працую членам культкамісіі, прымаю ўдзел у драматычным гуртку, магу развіваць свае здольнасці, магу вучыцца.

Усё гэта я атрымала дзякуючы Совецкай уладзе, дзякуючы нашай Сталінскай Канстытуцыі, самай дэмакратычнай ў свеце.

Я разумею вялікае значэнне выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР і стала агітатарам на 65 участку цэнтральнай выбарчай акрузе. Гэтай рабоце я аддаю ўсе свае сілы і вольны ад працы час. Я падрабязна азнаёмілася з біяграфіямі нашых кандыдатаў. Я зраблю ўсё, каб мабілізаваць сотні выбаршчыкаў на галасаванне за нашых кандыдатаў—лепшых сыноў працоўнага народа — тт. Кавалёва, Турлейскага і Цанава.

А. Высоцкая,
сельфактаршчыца фабрыкі № 29.

Аддам свой голас за лепшых сыноў народа

Набліжаецца дзень 24 сакавіка—дзень выбараў у *Вярхоўныя* Советы СССР і БССР. *І я задумваюся над тым, што са мной адбылося за гэтыя* пяць месяцаў, як існуе ў нас совецкая ўлада.

Быў я ткачом. 14 гадоў працаваў на фабрыцы капіталістаў Кнышынскіх. Жыццё наша было шэрае, без святла і радасці. Калі я прыхадзіў на фабрыку ў зімовы час, заўсёды з жахам глядзеў, ці не вывешана паведамленне аб закрыцці фабрыкі.

Але вось совецкая ўлада вызваліла нас. Мяне, ткача, вылучылі начальнікам ткацкага цэха. Спачатку я баяўся, што не спраўлюся з пастаўленай перада мной задачай. Але таварышы мне памаглі. І зараз ткацкі цэх працуе значна лепш, чым раней. У цэху чыстата і парадак. Палепшылася арганізацыя працы. *Раней быў адзін* майстар на дзве змены, зараз *па два майстры на адну. У нашым цэху працуюць 8 двух* станочнікаў і развіваецца соцспаборніцтва. Ткачы Каеўскі і Заёнц, якія раней выпрацоўвалі ад 28 да 30 тысяч удараў, даюць па 38 тысяч удараў.

Я вучуся, іду наперад. У нас зараз адкрыты шлях да навукі для кожнага працоўнага. Я з энтузіязмам пайду на выбары і аддам свой голас за лепшых сыноў працоўнага народа, за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за геройскага камандзіра Чырвонай Арміі тав. Кавалёва, зоркага чэкіста тав. Цанаву і т. Турлейскага.

М. Кананові́ч,
рабочы, начальнік ткацкага цэха фабрыкі № 18.

ВУЧКОМ ЗА РАБОТАЙ

Вучком 8-ай школы г. Беластока ўзначаліў соцыялістычнае спаборніцтва вучняў на лепшую вучобу і прыкладныя паводзіны. Соцдагаворы заключаны не толькі паміж класамі, але і паміж асобнымі вучнямі. Ход спаборніцтва правяраецца кожную шасцідзёнку. За апошнюю шасцідзёнку пяршынства заваяваў 9 клас «А», які дабіўся сярэдняй паспяховасці 4,14 бала.

Два разы ў месяц выпушчаецца насценная газета, у якой асвятляецца школьнае жыццё. Асобныя класы выпушчаюць свае класныя насценныя газеты. Пад кіраўніцтвам вучкома працуе мопраўская арганізацыя, якая налічвае 40 чалавек. Пры школе абсталяван мопраўскі куток.

Вучні актыўна ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да выбараў. Нарысавана 15 плакатаў, упрыгожана памяшканне выбарчага ўчастка. Рыхтуецца мастацкая самадзейнасць для абслугоўвання выбаршчыкаў.

Разгортвае работу асоавіяхімаўская арганізацыя, у якой налічваецца 90 вучняў. Мы будзем упорна авалодваць ваеннай справай, каб у патрэбную мінуту стаць на абарону нашай соцыялістычнай краіны.

Х. Вайнштэйн,
вучань 10 класа 8-ай школы.



На здымку: тав. Турлейскі Іван Антонавіч, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. (Фота Сапір).

МАСТАКІ БЕЛАСТОКА

НОВЫ ЭСКІЗ НАТАНА РАПАПОРТА

Думка аб увекавечанні моманту сустрэчы народаў Заходняй Беларусі з Чырвонай Арміяй заўладала выдатным мастаком, яшчэ да аб'яўлення конкурса. Аб яго праекце ў выглядзе коннай статуі і барэльефных груп наша газета ўжо ўпамінала.

Цяпер Натан Рапапорт увасобіў свой замысел яшчэ больш арыгінальна, шчыра, з вялікім майстэрствам мастака-рэаліста ў выглядзе групавога манумента.

Перад намі яшчэ толькі эскіз, але ён выканан з такім натхненнем, што захапляе гледача. На прамавугольніку цокаля з вялікім веданнем чалавечага цела і яго рухаў размешчаны фігуры такім чынам, што яны як-бы авалам групуюцца вакол чырвоных сцягоў.

Дамініруючы настрой задняга плана — гэта трагізм змардаванай маці, якая траціць апошнія сілы: яна ўжо не здольна ўтрымаць дзіця, якое вось-вось выслізне з яе рук.

У наступнай з левага боку групе ў двух жанчын мы ўжо наглядаем ціхі боль, які ў новай групе селяніна пад руку з чырвонаармейцам змяняецца брацкай любоўю. Тут мастак робіць паузу. Пачынае нарастаць пачуццё радасці (дзяўчынка кідае чырвонаармейцу кветку) і свае завяршэнне знаходзіць у магутным, шчырым парыве жывапіснай групы на пярэднім плане.

Тое-ж і з правага боку кампазіцыі. У трагізм няшчаснай жанчыны ўносіць момант заспакаення чырвонаармеец, які ласкава і клапатліва падтрымлівае яе. А далей — пачуццё радасці зноў нарастае і выліваецца ў выглядзе брацкага пацалунку з чырвонаармейцам і завяршаецца ўжо ўпамянутай групай жанчыны з дзіцём на першым плане. Яна нясе вестку вызвалення. Яе вопратка развіваецца на ветры, як сцягі.

Размяшчэнне фігур знойдзена скульптарам з выключнай умеласцю, вялікім густам і веданнем прасторы. Ні адна фігура не засланяе другой, кожная займае адпаведнае сабе месца. Кожны з персанажаў мае свой уласцівы яму жэст, свой непаўторны рух.

Усё тут жыве і дыхае рэальнай праўдай сапраўднага жыцця і пачуццяў. Уся кампазіцыя ў цэлым здзіўляе гледача сваёй гармоніяй і рытмам у нарастанні радасных пачуццяў па поваду вызвалення ад жахаў мінулага і завяршаецца заключным акордам шчасця ў вядучай групе пярэдняга плана.

Такі помнік на адной з плошчаў Беластока быў-бы дастойным пачаткам новай эры ў сэнсе мастацкага афармлення горада.

Ф. М. Эльтэрман.

ЧАМУ АДСТАЕ ПЯТЫ КАМБІНАТ

Пяты камбінат—адно з буйнейшых тэкстыльных прадпрыемстваў Беластока, на якім працуе звыш 1000 чалавек. У нашым калектыве многа добрых, адданых рабочых. Узоры ў рабоце паказваюць рабочыя: Глазер, Рубіновіч, Невядомскі, Ксенжковіч і многія іншыя.

На абслугоўванне двух станкоў перайшлі тт. Без М., Нішт М., Дзюшынскі Д. Грынцвайг Ю. і Шустар Б. Следуючы іх прыкладу, 100 ткачоў падалі заявы, у якіх выказваюць сваё жаданне перайсці на абслугоўванне двух станкоў. Але іх жаданне да гэтага часу не задаволена.

Наш галоўны інжынер тав. Фукс адкладвае правядзенне адпаведных тэхнічных мерапрыемстваў для пераходу на двухстаночную сістэму работы, спасылаючыся на неабходнасць правядзення ў першую чаргу рэканструкцыі камбіната.

Неабходна хутчэй зрабіць рэканструкцыю камбіната, бо ткацкі і прадзільны цэхі раскіданы *ў 6 розных памяшканнях*, што перашкаджае ў рабоце.

Соцспаборніцтва ў нас пакуль што слаба *разгорнута* і абмяжоўваецца толькі ткацкім цэхам. Адсутнасць соцспаборніцтва ў прадзільным цэху—асноўная прычына яго адставання. Наш фабком не змог узначаліць і арганізаваць соцспаборніцтва, а абком саюза шарсцянікаў не дапамог фабкому палепшыць работу. Гэтым тлумачыцца, што прадзільны цэх выканаў лютаўскі план усяго на 87,2 проц. не давыканаў план і адзелачны цэх.

Толькі днямі адбылася першая нарада стаханаўцаў, майстраў і інжынераў з удзелам членаў фабкома і профоргаў, на якой былі абгавораны пытанні соцспаборніцтва. Выступіўшы таварыш Шустэр указаў на неабходнасць паляпшэння работы прадзільнага і ткацкага цэхаў. Тав. Борад гаварыў аб адказнай ролі майстраў у новых умовах соцыялістычнай працы. Нарада выбрала камісію, якой даручана распрацаваць праект соцдагавора, які будзе абгаворан і прынят агульным сходам рабочых.

Асноўным недахопам у рабоце камбіната—гэта слабае разгортванне масава-палітычнай работы. Праўда, мы паслалі 25 агітатараў на выбарчыя ўчасткі, але на самым камбінаце мала чаго зроблена ў гэтым напрамку.

Мы павінны ў бліжэйшы час дабіцца карэннага паляпшэння ўсёй нашай работы.

Б. Юшынскі,
ткач-многастаночнік.
Прэнская,
інжынер-хімік.

ПАВЯЛІЧЫМ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

14 сакавіка, пасля работы, сабралося на сход у чырвоным кутку 70 чалавек рабочых, работніц і служачых 1-й дзяржаўнай канвертна-пераплётнай фабрыкі. З вялікай увагай сустрэлі яны інфармацыю аб мірным дагаворы паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай. У сваёй рэзалюцыі прысутныя запісалі:

«Адабраем мудрую сталінскую палітыку міру нашага Совецкага ўрада. Шлём палкае прывітанне доблесным воінам нашай роднай Чырвонай Арміі, якая аддана абараняе інтарэсы нашай радзімы супроць наглых вылазак імперыялістычных падпальшчыкаў вайны.

Абавязваемся павялічыць прадукцыйнасць працы, усямерна мацаваць абараназдольнасць нашай радзімы.

У надыходзячых выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР з радасцю аддадзім свае галасы за лепшых сыноў і дачок працоўнага народа—кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных».

Д. Розен.

Беластоку неабходзен дом настаўніка

Няма патрэбы даказваць, **якое значэнне мае дом настаўніка ў горадзе, дзе** ёсць **вялікая колькасць школьных работнікаў. Дом настаўніка — гэта перш за** ўсё цэнтр мета**дычнай работы.** Тут можна **абсталяваць** педагагічны кабі**нет, тут могуць** праводзіць **сваю работу метадычныя** сек**цыі. Але не** толькі **ў** гэтым **яго значэнне.** Дом **настаўніка—гэта цэнтр, праз якія настаўнікі ўцягваюцца ў грамадскае жыццё**, месца, дзе можна наладзіць культурную работу.

Чаму-ж да гэтага часу няма дома настаўніка ў Беластоку?

Абласны аддзел народнай асветы тлумачыць гэта адсутнасцю памяшкання. Але, відаць, справа не толькі ў гэтым. Пры жаданні памяшканне можна было-б знайсці. Прадаставілі-ж шахматыстам выдатны будынак для клуба. Відаць, уся справа ў паваротлівасці і ініцыятыве.

Тэлес.

СОВЕЦКІЯ ФІЗКУЛЬТУРНІКІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА СУСВЕТНЫЯ РЭКОРДЫ

Пяць год назад перад совецкімі фізкультурнікамі была пастаўлена задача дагнаць і перагнаць буржуазныя рэкорды ў спорце.

Совецкія фізкультурнікі з энтузіязмам адгукнуліся на гэты заклік. Першымі пачалі штурмаваць сусветныя рэкорды совецкія цяжкаатлеты-штангісты.

27 мая 1934 года на цяжкаатлетычных спаборніцтвах Масквы і Ленінграда ленінградскі фізкультурнік комсамолец Нікалай Шатаў паставіў першы совецкі сусветны рэкорд па штанзе. Выступаючы ў лёгкай вазе, ён левай рукой вырваў штангу вагой у 78,4 кілаграма, пабіўшы гэтым буржуазны сусветны рэкорд швейцарца Эшмана.

На 1 студзеня 1937 года з 35 зарэгістраваных за рубяжом сусветных рэкордаў па штанзе, 11 належала совецкім фізкультурнікам.

Зараз гэта лічба павялічылася ў два разы. 23 сусветных рэкорды па штанзе — вось выдатны адказ совецкіх гіравікоў на заклік заваяваць сусветныя рэкорды. За кожным з совецкіх сусветных рэкардсменаў стаяць дзесяткі і сотні фізкультурнікаў, якія толькі нямнога адсталі ад лепшых. За лепшымі з лепшых, такімі, як кіеўляне Георгій Папоў і Якаў Куцэнка, як ерэванцы Серго Амбарцумян і Рубен Манукян, як масквіч Александр Башко, стаіць 20-тысячная армія совецкіх гіравікоў, з якіх 102 чалавекі ўдастоены звання майстра гіравага спорту, і каля 300 чалавек—звання гіравіка 1-га разраду.

За гіравікамі ідуць майстры стралковага спорту. З 30 зарэгістраваных сусветных рэкордаў па стральбе 9 ужо адваёваны совецкімі стралкамі. У мінулым годзе на стралковай спартакіядзе народаў СССР масквіч Ілья Андрэеў, страляючы з малакалібернай вінтоўкі, з трох становішчаў: стоячы, лежачы і з калена — на 60 метраў выбіў 1165 ачкоў з 1200 магчымых, пераўзышоўшы гэтым сусветны рэкорд француза Мазуа.

Яшчэ больш выдатных вынікаў дасягнулі совецкія стралкі на міжнародных камандных завочных спаборніцтвах 1939 года. Каманда Цэнтральнага стралковага клуба Асоавіяхіма ў складзе стралкоў Іодка, Андрэева, Дукіна, Мініна і Пасімава аказалася лепшай сярод каманд усіх стралковых клубаў свету. Каманда выбіла 1992 ачкі з 2000 магчымых, перакрыўшы гэтым сусветны рэкорд амерыканскага стралковага клуба ў горадзе Портсмуце.

Выдатны сусветны клас совецкіх стралкоў пацвярджаецца і тым, што на гэтых-жа спаборніцтвах каманда студэнтаў Маскоўскага пединстытута імені Лібкнехта таксама перавысіла сусветны рэкорд Портсмуцкага клуба і заняла другое месца.

Паказальна, што на гэтых-жа спаборніцтвах 5 совецкіх стралкоў, страляючы з малакалібернай вінтоўкі, перакрылі індывідуальны сусветны рэкорд француза Дзюран, выбіўшы максімальную колькасць ачкоў: 400 з 400 магчымых.

Паспяхова змагаюцца за авалоданне сусветнымі дасягненнямі совецкія шахматысты. Іх выдатны клас — не выпадковая з'ява. У нашай краіне шахматы з'яўляюцца здабыткам многіх мільёнаў. Толькі адна Масква мае не менш 60.000 класіфікаваных шахматыстаў, а за права ўдзелу ў трэцім розыгрышы шахматнага пяршынства ВЦСПС змагалася да 700 тысяч шахматыстаў, арганізаваных у прафсаюзных добраахвотных спартыўных таварыствах. Гэты масавы рух вылучыў пляяду совецкіх шахматыстаў сусветнага класа, сярод якіх першае месца належыць гросмейстэру ленінградцу Міхаілу Батвінніку. У радзе буйнешных міжнародных шахматных турніраў ён быў наперадзе вядомых эксчэмпіёнаў свету, такіх карыфеяў шахматнага майстэрства, як Капабланка, Ласкер, Алёхін, Эйве і іншыя.

Сур'ёзных перамог у барацьбе за сусветныя рэкорды дасягнулі совецкія плаўцы, канькабежцы і лёгкаатлеты. Патрасаючы поспех мелі выступленні заслужанага майстра спорту плаўца Сямёна Байчэнка ва Францыі. Два сусветныя рэкорды, пастаўленыя Байчэнкам, зрабілі яго імя папулярным у замежных краінах. Дасягненні такіх майстроў плавання, як Юліі Качатковай і Леаніда Мяшкова, гавораць аб тым, што совецкія плаўцы могуць зусім паспяхова выступаць на водных дарожках Еўропы.

Совецкія майстры канькабежнага спорту не раз выступалі на катках Нарвегіі, Швецыі і Фінляндыі. Яны пакідалі ззаду многіх майстроў і чэмпіёнаў свету. Заслужаны майстар спорту Якаў Мельнікаў 13 разоў выйграваў міжнародныя спаборніцтвы. Не раз вырывалі перамогу ў замежных чэмпіёнаў совецкія майстры масквічы Кушын і Міхееў і ленінградзец Калінін.

Не меншы поспех суправаджаў на міжнародных канькабежных спаборніцтвах і совецкіх фізкультурніц. Сусветнай вядомасцю карыстаецца сярод іх Валенціна Кузняцова і Марыя Ісакава, якая падарыла краіне сусветны рэкорд у бегу на 1500 метраў.

Гэта — лепшыя. Але следам за імі ідзе армія маладых канькабежцаў, якія паспяхова авалодваюць вышынямі канькабежнай тэхнікі.

Да 1939 года совецкія лёгкаатлеты не мелі сусветных рэкордаў. Але 18 верасня 1939 года тбіліская фізкультурніца Ніна Думбадзе на спаборніцтвах у Маскве перакрывае буржуазны сусветны рэкорд у мятанні дыска. Яе вынік—49 м. 11 см. — на 80 сантыметраў больш сусветнага рэкорда, які на працягу апошніх трох год трымала немка Маўэрмайер.

Гэта далёка не адзіны факт, які пацвярджае міжнародны клас совецкіх лёгкаатлетаў. Еўрапейскі рэкорд масквіча Нікалая Азоліна ў прыжках з шастом, выдатныя вынікі ў бегу на 3, 5 і 10 тысяч метраў папулярнейшых маскоўскіх лёгкаатлетаў братоў Знаменскіх, выдатныя дасягненні ў бегу на 800, 1000 і 1500 метраў масквіча Пугачоўскага, рэкорды ў прыжках у даўжыню чырвонаармейца Гур'янава і многія іншыя — усё гэта гаворыць аб росце совецкіх лёгкаатлетаў, аб тым, што яны хутка вылучаюцца на перадавыя лініі ў барацьбе за сусветныя рэкорды.

Вышынямі лёгкаатлетычнай тэхнікі ў нас авалодваюць масы. У 1939 годзе на розыгрышы пяршынства Саюза ССР па лёгкай атлетыцы норму майстра выканалі 128, а норму першага разрада — 207 удзельнікаў, супроць 63 і 183 у 1938 годзе.

Дасягненні іншых атрадаў совецкай фізкультуры — футбалістаў, якія маюць у сваім активе выдатныя перамогі над буйнейшымі футбольнымі камандамі Еўропы, дасягненні баксёраў, якія выйгралі ў 1937 годзе матч у зборнай каманды Францыі, і т. д. — гавораць аб тым, што ўвесь наш фізкультурны рух паўсядзённа вырашае задачу авалодання сусветнымі рэкордамі.

Аднак гэтыя поспехі далёка яшчэ недастатковыя, калі супаставіць іх з той велізарнай увагай, якую ўдзяляе партыя і ўрад фізкультуры. Няма сумнення, што наперадзе — новыя сусветныя рэкорды, якія атрымаюць совецкія фізкультурнікі.

Заслужаны майстар спорту, ордэнаносец
А. Бухараў.

ЗА РУБЯЖОМ

АНГЛІЙСКІЯ РАБОЧЫЯ ВІТАЮЦЬ СОВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКІ МІРНЫ ДАГАВОР

Лондан, 15 сакавіка. (ТАСС). Англійскія рабочыя ўсюды адабраюць заключэнне мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй. Выканаўчы камітэт лонданскай «Федэрацыі барацьбы за мір» выказаў сваё глыбокае задавальненне совецка-фінляндскім мірным дагаворам і звярнуўся да ўсіх сваіх староннікаў з заклікам адзначыць гэтую падзею ўзмацненнем барацьбы супроць далейшых спроб расшырэння тэатра цяперашняй імперыялістычнай вайны. Выканком заклікае сваіх членаў узмацніць кампанію за хутчэйшае сканчэнне вайны на захадзе.

—o—

ПАВЕДАМЛЕННЕ АГЕНЦТВА РЭЙТЭР АБ НАСПЯВАННІ ЎРАДАВАГА КРЫЗІСА ВА ФРАНЦЫІ

Лондан, 15 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ў палітычных кругах Парыжа пануе вялікае ўзбуджэнне «у сувязі з нечаканым заканчэннем вайны паміж Фінляндыяй і СССР». Учарашняе пасяджэнне сената прадаўжалася тры з чвэрцю гадзіны і перанесена на сёння. У выніку ўчарашняга сакрэтнага пасяджэння сената «у многіх кругах ацэньваюць стварыўшаеся становішча, як вельмі напамінаючае міністэрскі крызіс». Некаторыя лічаць, падкрэслівае далей агенцтва, што, магчыма, адбудуцца змены ў саставе кабінета, у прыватнасці, будзе назначан новы міністр замежных спраў, пост якога зараз па сумяшчэнню займае Далад'е.

—o—

ІРАНСКАЯ ГАЗЕТА АБ ГАНДЛЁВЫМ ДАГАВОРЫ ПАМІЖ СССР І ІРАНАМ

Тэгеран, 15 сакавіка. (ТАСС). Вячэрняя газета «Этэлаат», публікуючы паведамленне аб парафіраванні новага гандлёвага пагаднення паміж Совецкім Саюзам і Іранам, піша: «Паведамленне аб парафіраванні ірана-совецкага гандлёвага пагаднення, якое будзе ў бліжэйшы час падпісана ў Тэгеране, сустрэта з вялікім задавальненнем. Яно прынесла нам вялікую радасць, бо дагавор умацуе нашы адносіны і забяспечыць узаемна выгаднае развіццё эканамічных адносін паміж СССР і Іранам. Ясна, што дзве краіны, якія маюць сухаземную і марскую граніцу адлегласцю больш двух тысяч кіламетраў, маюць патрэбу ва ўстанаўленні цесных гандлёвых адносін, якія павінны ўзмацняцца з дня ў дзень».

Замежны друк аб заключэнні мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй

БАЛГАРЫЯ

Сафія, 15 сакавіка. (ТАСС). **Балгарскі друк прадаўжае шырока каментыраваць совецка-фінляндскі мірны дагавор. Большасць газет прысвячае гэтаму дагавору свае перадавыя і публікуе шматлікія водгукі замежнага друку. Газета „Заря“ у перадавым піша: „Заключэнне совецка-фінляндскага мірнага дагавора з'явілася буйнейшай падзеяй. У цяперашнія цяжкія часы людзі прывыклі атрымліваць толькі дрэнныя паведамленні. Совецка-фінляндскі мірны дагавор з'явіўся зззяючым праменем у цемры“. Газета ўказвае далей, што значэнне гэтага дагавора выходзіць далёка за межы ліквідацыі мясцовага канфлікта, бо „за падзеямі ў Фінляндыі скрываўся больш шырокі план заходніх дзяржаў“.**

У першы час, піша газета, выключна суровая зіма і рад падобнага-ж роду прычын не далі магчымасці нанесці хуткі ўдар. Але ў пачатку лютага, калі кліматычныя ўмовы некалькі палепшыліся, совецкія войскі пачалі наступленне, якое прадстаўляе сабой бліскучае выкананне выдатна задуманага стратэгічнага плана. Было занята звыш 1 000 умацаванняў. Гісторыя не ведала падобнага прыкладу, Фінскае супраціўленне было зламана. „Мірны дагавор, заключаны 12 сакавіка, — указвае ў заключэнне газета, — адабраюць усе нейтральныя краіны. Ён з'яўляецца папярэджаннем усім падпальшчыкам вайны. Ён з'яўляецца велізарным крокам да ўсеагульнага міру“.

Аўтар перадавога артыкула газеты „Утро“ прафесар Генаў указвае, што ў выніку заключанага міру Совецкі Саюз забяспечвае сваю безапаснасць. Газеты „Мир“ і „Слово“ у сваіх перадавых вітаюць заключэнне мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй, падкрэсліваючы, што гэта гістарычная падзея абмяжоўвае распаўсюджванне вайны і набліжае народы да мірнага жыцця.

Газета „Заря“ апісвае, з якім энтузіязмам сустрэлі рашэнне свайго ўрада народы Совецкага Саюза.

З вялікім артыкулам, прысвечаным дагавору, выступіў у той-жа газеце палкоўнік запасу Курцеў. Падкрэсліўшы велізарнае значэнне дагавора, ён піша: „Совецкі Саюз, умацаваўшы свае граніцы, у яшчэ большай меры становіцца буйнейшым фактарам міру“. Курцеў адзначае, што СССР задаволіўся толькі тымі мінімальнымі аб'ектамі, якія яму так неабходны для забеспячэння сваіх паўночных граніц і ў асаблівасці Ленінграда. У заключэнне аўтар піша: „Заключаючы мір з малой Фінляндыяй, СССР яшчэ раз пацвердзіў, што ён не жадае ўмешвацца ва ўнутранае жыццё сваіх суседзяў і нічога не патрабуе ад нейтральных і малых дзяржаў. Гэтай разумнай і мудрай палітыкай СССР павялічвае свой прэстыж, як друга нейтральных і малых народаў, якія стаяць за шчыры і лаяльны мір“.

ВЕНГРЫЯ

Будапешт, 15 сакавіка. (ТАСС). У цэнтры ўвагі ўсяго венгерскага друку па-ранейшаму стаіць совецка-фінляндскі мірны дагавор. Газеты ў вялікіх артыкулах выказваюць сваё поўнае задавальненне гэтым дагаворам. Венгерскі народ, піша «Мад'яршуг», не можа не выказаць радасці па прычыне мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй.

Берлінскі карэспандэнт той-жа газеты адзначае, што ўмовы міру паміж СССР і Фінляндыяй не закранаюць асноў самастойнага існавання Фінляндыі.

ЭСТОНІЯ

Талін, 15 сакавіка. (ТАСС). Мірны дагавор паміж СССР і Фінляндыяй, піша газета «Балтык айн», з'яўляецца выдатным па зместу дакументам. Ён гарантуе стратэгічныя пазіцыі Совецкага Саюза ў Балтыйскім моры. Такі стратэгічны пункт, як Ханко, арганічна звязан з совецкімі ваеннымі базамі ў балтыйскіх краінах, якія СССР атрымаў у адпаведнасці з пактамі аб узаемадапамозе. У той-жа час, адзначае газета, гэты дагавор мае вялікае значэнне для ўсіх нейтральных дзяржаў, таму што ён устараняе распаўсюджванне вайны на краіны Паўночнай Еўропы.

КІТАЙ

Чунцын, 15 сакавіка. (ТАСС). Усе кітайскія газеты 14 сакавіка апублікавалі совецка-фінляндскі мірны дагавор. Агенцтва Сентрал ньюс перадало тэкст дагавора па радыё для мясцовага друку.

Паведамленне аб падпісанні дагавора сустрэнута кітайскімі кругамі і друкам з вялікім задавальненнем. Усе газеты прысвяцілі дагавору перадавыя артыкулы, у якіх вітаюць мірную палітыку СССР.

Газета «Дагунбао» піша, што заключэнне дагавора з'яўляецца дасягненнем мірнай палітыкі СССР і скарачае маштабы вайны ў Еўропе.

Газета «Гоміньгунбао» піша: «Мірны дагавор паміж СССР і Фінляндыяй акажа ўплыў на ўсю міжнародную абстаноўку. Безапаснасць на Балтыйскім моры стала трывалай».

Газета «Шушусіньбао» заяўляе: «Заключэнне мірнага дагавора з Фінляндыяй яшчэ раз пацвярджае нязменнасць палітыкі СССР. СССР перш за ўсё абараняе сябе ад утаржэння, робячы гэтым уклад у барацьбу за мір. Некаторыя капіталістычныя краіны Еўропы спрабавалі выкарыстаць паўночныя краіны для нападу на СССР. Існавала магчымасць скарыстання Фінляндыі для нападу на Ленінград. Зараз гэтая магчымасць ліквідавана».

Газета «Сіньхуажыбао» указвае, што Фінляндыя атрымала незалежнасць у выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі, але яе ўрад быў звязан з імперыялістычнымі краінамі і рыхтаваў на тэрыторыі Фінляндыі плацдарм для нападу на СССР. Мірная палітыка СССР і магутнасць яе Чырвонай Арміі нанеслі цяжкі ўдар па антысовецкіх планах. «Дагавор з Фінляндыяй,—піша газета,—гэта паражэнне імперыялістаў, якія імкнуліся распаліць вайну ў паўночнай Еўропе. У выніку гэтага антываенныя сілы свету яшчэ больш умацаваліся і антысовецкія планы разладжаны. Мы віншуем прыяцельскую краіну з поспехамі яе мірнай палітыкі».

ЗША

Нью-Йорк, 15 сакавіка. (ТАСС). Газета «Нью-Йорк джорнэл энд амерыкен» піша, што мір, заключаны паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй, служыць справе ўмацавання усеагульнага еўрапейскага міру. Па крайняй меры, указвае газета, адзін тэатр ваенных дзеянняў ліквідаван, і прадухілена распаўсюджванне вайны на поўнач.

«Дэйлі уоркер» піша, што совецка-фінляндскі мірны дагавор разладзіў планы імперыялістаў, якія імкнуліся распаўсюдзіць вайну на скандынаўскія краіны. Згавор падпальшчыкаў вайны, працягвае газета, разбіт ушчэнт узброенай сілай Совецкага Саюза, яго непераможнай Чырвонай Арміяй, сталінскай мірнай палітыкай і людзьмі соцыялістычнай дзяржавы, гераізм якіх не мае сабе роўнага ў гісторыі.



У кіно-тэатры «Спартак» дэманструецца фільм «Падкідыш».
На здымку: кадр з фільма. У ролі Наташы — Вераніка Лебедзева, у ролі яе маці — О. А. Жызнева. (Фота-клішэ ТАСС).

Дзіўнае патрабаванне

У канцылярыю Беластоцкага педагагічнага інстытута ўвайшла маладая дзяўчына. Яна падышла да сакратара і сказала:

— Скажыце, калі ласка, педінстытут — гэта вышэйшая навучальная ўстанова?

— А як-жа, — адказаў сакратар.

— Гэта добра, — абрадавалася дзяўчына, — у такім выпадку, будзьце ласкавы, выдайце мне дыплом аб сканчэнні педінстытута.

Сакратар спачатку аслупянеў, а потым запытаўся:

— А на якой падставе выдаць вам дыплом? Вы — што, закончылі наш інстытут?

— Ды не, — рассмяялася дзяўчына, — я закончыла толькі пачатковую школу. Дыплом мне патрэбен для таго, каб атрымаць совецкі пашпарт. Без прадстаўлення дыплома вышэйшай навучальнай установы не выдаюць пашпартоў.

— Кіньце глупства малоць!—злосна сказаў сакратар, — у Совецкім Саюзе грамадзяне атрымліваюць пашпарты незалежна ад іх асветы.

— І вы мне не верыце? — захвалявалася дзяўчына, — вось ужо дзесяты чалавек не верыць мне. Калі ласка, пойдзеце са мной на пашпартны пункт № 1, які знаходзіцца ў доме № 6 па Чырвонаармейскай вуліцы, прачытайце там аб'яву на дзвярах і тады напэўна паверыце.

* * *

Дзяўчына была права. Сапраўды, на дзвярах пашпартнага пункта № 1 вось ужо некалькі дзён вісіць наступная аб'ява на польскай мове:

«Дакументы, неабходныя для атрымання пашпарта: 1. Даведка, падпісаная ўласнікам дома ці домаўпраўленнем. 2. Ваенны білет. 3. Пасведчанне аб нараджэнні. 4. Дыплом вышэйшай навучальнай установы...» і т. д.

На гэтых-жа дзвярах вісіць таксама надрукаваны рускі тэкст аб'явы аб дакументах, неабходных для атрымання совецкага пашпарта. У рускім тэксце, зразумела, няма гэтага дзіўнага патрабавання аб прадстаўленні дыплома вышэйшай навучальнай установы. Якім-жа чынам у польскім тэксце аказалася гэта здзіўляючае патрабаванне, якое датычыцца ўсіх без выключэння грамадзян? На такое пытанне няхай адкажа начальнік пашпартнага пункта № 1.

В. Бемаў.

НАРАДА ЧЛЕНАЎ РЭДКАЛЕГІЙ НАСЦЕНГАЗЕТ

Днямі ў Гродна адбылася першая нарада членаў рэдкалегій насценгазет, скліканая гаркомам КП(б)Б і рэдакцыяй газеты «Свабодная Беларусь». На нарадзе прысутнічала 65 чалавек. Нарада заслухала даклад сакратара гаркома партыі тав. Дружыніна аб задачах нізавога друку ў дні выбарчай кампаніі. Затым выступіўшыя ў спрэчках члены рэдкалегій абмяняліся вопытам сваёй работы.

Зараз на прадпрыемствах і ва ўстановах горада выходзіць больш 50 насценных газет. Рэгулярна выпушчаюцца насценныя газеты на табачнай фабрыцы, веласіпедным заводзе, абутковай фабрыцы і інш.

Нарада намеціла рад канкрэтных мерапрыемстваў па забеспячэнню бесперабойнай работы рэдкалегій па выпуску насценных газет.

ХАЛАДЗІЛЬНІК У ГОР. БЕЛАСТОКУ

У Беластоку да гэтага часу не было халадзільніка. У гэтым годзе ў горадзе намечана пабудова халадзільніка ёмкасцю у 1200 тон.

Беластоцкі філіял Белдзяржпраекта, у бліжэйшы час прыступае да тэхнічных вышукаў і гідрагеалагічных работ, на падставе якіх будзе распрацаван дэтальны план будаўніцтва гэтага халадзільніка. Будаўніцтва яго будзе каштаваць звыш 3 мільёнаў рублёў.

ЛІКВІДАЦЫЯ БЕСПРАЦОЎЯ

За апошні час у Гродна на работу ў прадпрыемствы і ўстановы накіравана 4000 беспрацоўных. У горадзе поўнасцю ліквідавана беспрацоўе настаўнікаў, урачоў і інжынераў. Многа беспрацоўных паслана на работу ў Данбас і Сталінск.

У бальніцах і амбулаторыях горада зараз працуе 125 урачоў, тады як пры панскай уладзе іх было толькі 6. Значна павялічылася таксама колькасць інжынерна - тэхнічных работнікаў на прадпрыемствах горада.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

16 сакавіка, у 8 гадзін вечара, у Доме партасветы (вул. Галстога, 9) будзе прачытана **лекцыя для настаўнікаў г. Беластока** на тэму: «Дзяржаўнае устройства СССР».

Чытае лектар ЦК КП(б)Б т. Хейфец.

Аддзел прапаганды і агітацыі гаркома КП(б)Б.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Кіно-тэатр „СПАРТАК“

ПАДКІДЫШ

Сеансы ў 7, 9.15 і 11.15 гадзін
У файе — канцэрты аркестра.

Кіно-тэатр „СВОБОДА“

Вясёлая музыкальная камедыя

Багатая нявеста

Муз. І. О. Дунаеўскага

Звыш праграмы — **канцэрт**
Сеансы ў 6.30, 8.45 і 11 гадзін
Каса адкрыта з 2-х гадзін дня.

Кіно-тэатр „Чырвоная Зорка“

КАНЦЭРТ БЕТХОВЕНА

кампазітар ДУНАЕЎСКІ
Сеансы ў 5, 7, 9 і 11 гадзін
Каса адкрыта з 2-х гадзін

Кіно-тэатр „РОДИНА“

СЫНЫ ПРАЦОЎНАГА НАРОДА

Сеансы ў 7, 8.30 10 і 11.30 гадзін.
Каса адкрыта з 2-х гадзін

Другі Беларускі Дзяржаўны Драматычны Тэатр
17,18 сакавіка Н. ПАГОДЗІН

„ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ“

п'еса ў 3-х актах.
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 1—3 і з 5—9 гадзін веч.
16 сакавіка спектакля няма.
Білеты, праданыя на 13 сакавіка сапраўдны на 2-е красавіка.
Дырэкцыя.

Тэатр „Палас“

ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР МІНІЯТУР

16 сакавіка

Вечар песні і пляскі

Пастаноўка:
ДЖЫГАН і ШУМАХЕР.
Пачатак у 9 гадзін.
Білеты ў касе тэатра.

ДА ВЕДАМА ГРАМАДЗЯН г. БЕЛАСТОКА.

З 19 лютага па вул. Чырвонаармейскай, № 1

АДКРЫТА ДЗЯРЖАЎНАЯ АШЧАДНАЯ КАСА № 6409

АШЧАДКАСА робіць прыём і выдачу ўкладаў да запатрабавання і тэрміновых.

АШЧАДКАСА выплачвае грамадзянам па ўкладах да запатрабавання 3% гадовых і па тэрміновых укладах — 5% гадовых.

Аб правядзенні іншых аперацый будзе аб'яўлена дадаткова.

АШЧАДКАСА адкрыта з 10 гадзін раніцы да 16 гадзін вечара.

Цэласнасць укладаў, унесеных у ашчадныя касы, **гарантыруецца ўрадам Саюза ССР.**

Ашчадныя касы строга захоўваюць тайну ўкладаў.

У аддзел аб'яў звaніце па тэл. 16-10

БЕЛАСТОЦКАЯ МІЖАБЛАСНАЯ КАНТОРА „САЮЗЗАГОТСКУР“

скупляе скураную сыравіну

СКУРЫ:
рагатай жывёлы,
коней, свіней,
парасят, авечак,
коз і інш.,
а таксама конскі
волас і шчаціну.
Сыравіну прымаюць
па ўстаноўленаму
стандарту
МІЖРАЙЗАГОТ-
КАНТОРЫ,
ЛАРКІ, БОЙНІ,
АГЕНТЫ „САЮЗ-
ЗАГОТСКУР“
і СЕЛЬПО.

Захоўвайце скуры ад псавання. За высокаякасную сыравіну атрымаеце больш высокую цану.

Беластоцкая міжабласная кантора „САЮЗЗАГОТСКУР“.

ПАСТАНОВА

гарадскога выканаўчага камітэта г. Беластока ад 13 сакавіка 1940 года.

г. Беласток

АБ РАЗГЛЯДЗЕ АКТАЎ ГОРСАНІНСПЕКЦЫІ г. БЕЛАСТОКА

Гарадскі выканаўчы камітэт ПАСТАНАЎЛЯЕ:

За невыкананне абавязковай пастановы ад 26. XII. 39 г. аб ачысткі двароў і вуліц ад снегу і лёду, аштрафаваць ДОМАЎЛАСНІКАЎ па 100 рублёў кожнага:

1) Айзенштадт Юдэля Пінхасавіча (Пролетарская, № 19);
2) Левіна Генендэля Мордхелевіча (Хазановіча, № 17);
3) Ліс Сіму Паеўну (Сухая, № 23);
4) Гольдберг Мар'яну Нусенаўну (Авіяцыйная, 32);
5) Ванеўскую Геню Іцкаўну (Хазанавіча, № 14);
6) Броера Абрама Ошэравіча (Беласточанская, № 26);
7) Ганіондскага Хаім-Лейбу Калманавіча (Гелдовая, № 1);
8) Лікер Сару Мeeраўну (Калушынская, № 10);
9) Трашчанскага Мордуха Давідавіча (Новы Свет, № 28).

Старшыня гарадскога выканаўчага камітэта
ГАРЭЛІК
Адказны сакратар
ОКУНЬ

БЕЛАСТОЦКІ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

аб'яўляе набор слухачоў на 6-месячныя курсы настаўнікаў рускай і беларускай мовы і літаратуры для выкладання ў 8—10 класах сярэдняй школы.

На курсы прымаюцца асобы, маючыя вышэйшую і незаконачаную вышэйшую асвету.

Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй і кватэрнымі.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі педінстытута штодзённа з 10 да 15 гадзін 30 мінут дня да 1 красавіка.

Заняткі пачнуцца 1 красавіка.

Педагагічны інстытут.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята —23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 362.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.